***І.Ю. Козіч***
БДЭУ (Мінск)

# РОЛЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ Ў РАЗВІЦЦІ ПІСЬМЕННАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ

Сярод прадстаўнікоў еўрапейскага Адраджэння асаблівае месца займае імя ўсходнеславянскага і беларускага гуманіста, першадрукара і асветніка, вучонага і пісьменніка, ураджэнца старажытнага Полацка Францыска Скарыны.

Францыск Лукіч Скарына беларускі навуковец, філосаф, медык (доктар медыцынскіх навук), першадрукар, заснавальнік ўсходнеславянскага кнігадрукавання

Нарадзіўся Скарына 24 красавіка 1490 года ў горадзе Полацку (ВКЛ) у сям'і купца Лукі. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Полацку. У 1504 годзе стаў студэнтам Кракаўскага ўніверсітэта. Затым, у 1506 годзе Ф.Скарына заканчвае факультэт «сямі вольных мастацтваў» (граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка) са ступенню бакалаўра, у наступстве атрымлівае ступень доктара "вольных мастацтваў».

Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны была своеасаблівым сінтэзам вопыту еўрапейскага кнігавыдання і традыцый беларускага мастацтва. Скарына працягнуў сваё навучанне ў Чэхіі, дзе першым сярод усходніх славян выдаў ў Празе друкаваную кнігу Біблію. Скарына пераклаў Біблію на царкоўнаславянскую мову беларускай рэдакцыі, якая была зразумелай простым людзям, жыхарам ВКЛ.

У Біблію Скарына уключыў амаль паўсотні ілюстрацый. Шматлікія застаўкі, іншыя дэкаратыўныя элементы, гарманавальныя з вёрсткай старонак, шрыфтам і тытульнымі лістамі. У яго пражскіх выданнях - мноства арнаментальных упрыгожванняў і каля тысячы графічных ініцыялаў. Пазней, у 1517 годзе, заснаваў у Празе друкарню, у якой выдае кірылічным шрыфтам «Псалтыр», першую друкаваную беларускую кнігу. Мецэнатамі Францыска Скарыны былі Багдан Анкоў, Якуб Бабіч, а таксама ваявода троцкі і вялікі гетман літоўскі князь Канстанцін Астрожскі.

У 1520 годзе Скарына пераязджае ў Вільню, дзе засноўвае першую друкарню на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Там выдае «Малую падарожную кніжку» (1522 год) і «Апостал» (1525 год). Пазней, у 1534 годзе, Ф.Скарына ажыццяўляе паездку ў Маскоўскае княства.Але там ён не знайшоў паразумення і быў выгнаны як ерытык, а яго працы былі спалены.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што дзейнасць Францыска Скарыны аказала вялікі ўплыў на развіццё кнігадрукавання і пісьменства Беларусі, на ўсіх абшарах Вялікага Княства Літоўскага, а таксама іншых усходнеславянскіх краінах. Яго кнігі аказалі значны ўплыў на развіццё беларускай мовы. Скарына быў не толькі геніем эпохі Рэнесансу, але перш за ўсё выбітным сынам сваёй Радзімы. Вывучэнне дзейнасці Францыска Скарыны дае права паставіць яго ў адзін шэраг з такімі вялікімі асобамі эпохі Адраджэння, як Леанарда да Вінчы, Ян Амос Каменскі, Рафаэль, а беларускую культуру, на ніве якой ён працаваў, у адзін шэраг з еўрапейскай культурай.